4. *Апель, К. О.* Трансформация философии / К.О. Апель ; пер. с нем. В. Куренной [и др.]. – М. : Логос, 2001. – 344 с.
5. *Ясперс, К.* Всемирная история философии. Введение / К. Ясперс. – СПб. : Наука, 2000. – 272 с.
6. *Шубарт, В.* Европа и душа Востока / В. Шубарт ; пер. с нем. З. Г. Антипенко, М. В. Назарова. – 2-е изд. – М. : Альманах «Рус. идея», 2000. – 448 с.
7. *Гюнтер, Р.* История культуры / Р. Гюнтер. – СПб. : Издание А. С. Суворина, 1901. – 352 с.

**А. М. Кушнярэвіч**

# РОЛЯ НЯМЕЦКАГА АРХІТЭКТАРА Я. С. БЭКЕРА Ў РАЗВІЦЦІ БАРОЧНА-КЛАСІЦЫСТЫЧНАЙ СТЫЛІСТЫКІ БЕЛАРУСКАГА ДОЙЛІДСТВА

Найбольш раннія праявы класіцызма ў архітэктуры беларускіх земляў супадаюць з эпохай Асветніцтва, ахопліваюць першыя два яе дзесяцігоддзі і звязаны са стылістыкай барочнага класіцызма. Яго распаўсюджванне ў дойлідстве беларускіх земляў, як і ў цэлым Рэчы Паспалітай, пераважна ініцыіравалася заказамі сацыяльнай эліты, сярод якой значнае месца займалі архітэктурна-будаўнічыя задумы прадстаўнікаў каралеўскага двара. Аднак на беларускіх землях з пачатку 1760-х гадоў рысы класіцызма праявіліся не ў дынастычным будаўніцтве, а ва ўладаннях канцлера Вялікага Княства Літоўскага (далей ВКЛ) Аляксандра Міхаіла Сапегі, які належыў да старажытнага магнацкага роду, прадстаўнікі якога былі не толькі буйнымі землеўладальнікамі, але і займалі ў згаданай дзяржаве розныя вышэйшыя пасады [1, с. 24]. Росквіт роду Сапегаў прыйшоўся на XVI–XVII стст., калі па свайму палітычнаму становішчу і памерах багацця яны ўступалі толькі Радзівілам [2, с. 545–546]. Эпоха Асветніцтва як бы надала другое дыханне дзейнасці прадстаўнікоў гэтага старажытнага рода. Пад уплывам новых ідэй Сапегі пачалі абшырнае будаўніцтва ў сваіх беларускіх уладаннях, якое па размаху, мастацкаму ўзроўню і глыбіні выражаемых мастацкіх ідэй адпавядала каралеўскаму. У гэтым будаўніцтве ідэі Асветніцтва зліліся з імкненнем уваскрэсіць былую славу Сапегаў, адрадзіць іх радавую рэзідэнцыю, заснаваную самым славутым прадстаўніком роду – канцлерам ВКЛ Львом Сапегам. Архітэктурна-будаўнічыя задумы дапамог рэалізаваць А. Сапегу дойлід нямецкага паходжання Ян Самуэль Бэкер. Яго архітэктурная спадчына – найбольш значная сярод вядомых творцаў XVIII ст. (Л. Гуцэвіч, М. Кнакфус, К. Скампані, Я. Падчашынскі, Л. Лутніцкі, Дж. Сакко і інш.), якія працавалі на Беларусі [1, с. 24–25].

Архітэктар Я. С. Бэкер нарадзіўся і вучыўся архітэктуры ў Саксоніі, прыехаў у ВКЛ у канцы 50–пачатку 60-х гг. XVIII ст. ва ўзросце каля 25–30 гадоў.

Жыў у Ружанах, працаваў у канцлера А. Сапегі. Пасля яго смерці ў 1793 г. выехаў з Ружан, але працягваў адтуль атрымліваць пенсію. Пра нацыянальнае паходжанне Я. С. Бэкера сведчаць надпісы, зробленыя па-нямецку на чарцяжах. З актавых запісаў ружанскага касцёла вынікае, што ён па веравызнанню быў пратэстантам.

Прысутнасць саксонскіх архітэктараў у ВКЛ звязана з каралеўскай уладай Рэчы Паспалітай, якая належала ў 1697–1763 гг. саксонскім курфюрстам Аўгусту II і Аўгусту III. Таму каралеўскія рэзідэнцыі ў Варшаве і Гародні будаваліся ў першай палове XVIII ст. на французскі манер дрэзданскімі прыдворнымі архітэктарамі: бацькам і сынам М. Д. і К. М. Пёпельманамі, Я. Д. Яўхам, Я. З. Дэйбелям і іншымі. Некаторыя з упамянутых архітэктараў праектавалі таксама палаца-паркавыя комплексы і сядзібы для мясцовай заможнай шляхты. Попыт на навамоднае будаўніцтва спрыяў наплыву ў Рэч Паспалітую дрэзданскіх майстроў. Асабліва значны прыток саксонцаў адбыўся падчас Сямігадовай вайны (1756–1762), калі ўвесь дрэзданскі каралеўскі двор пераехаў у Варшаву [3, с. 66–67; 4; 5]. Я. С. Бэкер падтрымліваў цесныя кантакты з варшаўскімі, віленскімі архітэктарамі, якія працавалі пад моцным уплывам французскга класіцызма, рысы якога прасочваюцца у яго архітэктурных праектах для Сапегаў [2, с. 26].

Да нашага часу захавалася некалькі пабудоў, звязаных з дзейнасцю Бекера ва ўладаннях гэтага роду. У асноўным яны знаходзяцца ў Ружанах Пружанскага раёна: Петрапаўлаўскі манастыр базыльян, 1762–1779; карчма «Пад зоркай» 1778; інтэр'ер Троіцкага касцёла, 1779; прыбудаваная да яго капліцы Барбары, 1786; пераробка і разбудова мясцовага палацавага комплексу, 1772–1777 (захаваўся ў руінах); капліца Казіміра на могілках, 1790–1792. Захаваліся арыгінальныя чарцяжы Бэкера, выяўленыя В. Калніным, ў фондзе Сапегаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта. Яны выкананы тушшу на паперы, большасць іх падмалявана акварэллю. Чарцяжы былі падораны архітэктарам свайму мецэнату ў 1788 г., частка з іх загінула. Сярод 36 захаваных 8 падпісаны па-французску: «J.S. Becker Lieut. Architecte». Маюцца праекты палацавых тэатральных, сакральных, жылых збудаванняў з цэглы і дрэва, тэхнічных (калодзеж, печы для выпальвання цэглы і кухонныя), парку.

Ацалелі праекты Бэкера для Ружанаў: палаца, палацавага парку, шніталю, палацыка і афіцыйны ў Крыстыянопалі – падместачковым фальварку. У архівах маюцца праекты таксама для іншых уладанняў Сапегаў у Вільні, Высокім-Літоўскім, Дзярэчыне і некаторых неўстаноўленых месцаў. Частка чарцяжоў надрукавана ў беларускіх выданнях 70–80-х гг. па архітэктуры, але дадзеныя ім каментарыі і заўвагі часам недакладныя [3, с. 69]. Між тым публікацыі польскага даследчыка Р. Афтаназі [4] і беларускага гісторыка архітэктуры В. Калніна [5] дазваляюць больш дакладна ахарактарызаваць праектную спадчыну і дзейнасць Я. С. Бэкера – неардынарнага архітэктара другой паловы XVIII ст., які амаль цалкам працаваў у Беларусі і заставаўся тут да канца жыцця. Вядома, што ён быў прыдворным

архітэктарам Сапегаў у Ружанах і Дзярэчыне, у Ружанах у 1793 г. утрымліваў жыллё, у 1798 г. атрымаў ад Сапегаў пажыццёвую пенсію ў памеры 2160 злотых.

Архітэктурныя чарцяжы Я. С. Бэкера недатаваныя. Аднак ускосныя звесткі дазвалілі В. Калніну скласці пэўную храналогію яго творчасці: да 1765 – малы тэатр у Дзярэчынне ці Зэльве; 1768 – фундацыя капліцы Езуса ў ружанскім касцёле, 1772–1775 – галоўны корпус ружанскага палацу; 1772–1778 – царква базыльянаў у Ружанах; 1772–1777 – брама ружанскага палацу з бакавымі карпусамі; 1773 – кляштар баніфратараў у Высокім-Літоўскім; 1773–1775 – працы ў ружанскім парку; 1776–1777 – галерэя (аркады), палацавая афіцына ў Ружанах; 1778 – карчма ў Ружанах; 1779 – пераробка дэкору ў ружанскім касцёле; 1786 – пераробка дзярэчанскай «Акадэміі» на палац; 1787 – узвядзенне капліцы ў ружанскім касцёле; 1790–1792 – капліца Казіміра на ружанскіх могілках; 1790 – пачатак будаўніцтва шпіталю ў Ружанах; 1793 – пераробка дзярэчанскага палацу для Францішка Сапегі з жонкай [3, с. 74].

Дадзеную храналогію творчасці Я. С. Бэкера пры Сапегах можна падзяліць на два перыяды. Першы, умоўна названы тэатральна-палацавым, працягваўся ад пачатку 1760-х па 1780 г. і вызначаецца познебарочнай стылістыкай. Другі перыяд прыпадае на 1780–1793 гг. Тут пераважае касцёльна-кляштарнае будаўніцтва ў стылі класіцызму [3, с. 76]. У 1794 г. прыдворным архітэктарам Сапегаў становіцца двадцаці шасцігадовы Міхал Кадо. Гэта ўказвае на тое, што творчасць Бэкера для Сапегаў скончылася. Аднак ён застаўся на Беларусі, напэўна, да самай смерці. Дакументы свед-чаць пра яго пенсійнае забяспячэнне Сапегамі аж да 1810 г., якое ў гэты год ён атрымліваў у Мінску. Тут, магчыма, памёр і быў пахаваны [3, с. 85].

Найбольш значныя будаўнічыя працы Я. С. Бэкер разгарнуў у Ружанах, дзе буйнейшая ў Беларусі прыватнаўласніцкая рэзідэнцыя стваралася некалькімі пакаленнямі Сапегаў. Галоўнай архітэктурнай задумай была рэканструкцыя палаца, гісторыя будаўніцтва якога адносіцца да пачатку XVII ст., калі Л. Сапегам быў узведзены, напэўна, па праекту скульптара і архітэктара з Фларэнцыі Санці Гуччы, які прымаў удзел у рэканструкцыі каралеўскага палаца ў Гродна [3, с. 67], двухпавярховы крыжападобны ў плане мураваны палац з трыма вежамі: 2 квадратныя ў плане на галоўным фасадзе і тарцы левага крыла і 5-гранная на паўночна-ўсходнім вугле. У цэнтральнай частцы палаца, якая выступала глыбокім рызалітам, знаходзіліся вестыбюль з 4-маршавай лесвіцай і вялікая зала на 2-м паверсе, у бакавых частках – жылыя пакоі, кабінеты, архіў, бібліятэка. Унутраная планіроўка анфіладная. Памяшканні на першым паверсе мелі скляпеністыя, на 2-м – бэлечныя перакрыцці. Пад палацам знаходзіліся 2-я павярховыя скляпеністыя падвалы [8, с. 367]. У сярэдзіне XVII ст. пры Казіміры Сапегу палац перабудоўваўся, відаць, італьянскім архітэктарам Джавані Батыстам Джыслені, які з’яўляўся аўтарам надмагільнага помніка для першай жонкі сапегі Тэадоры Крыстыны. У 1698 г. канфедэратамі і ў Паўночную вайну1700–1721 гг. шведамі ён быў

амаль разбураны і адноўлены ў 1748–1750 гг. у познебарочным стылі па праекту нямецкага архітэктара Іяана Зыгмунта Дэйбля, аднаго з лепшых каралеўскіх архітэктараў таго часу. Дэталі той познебарочнай перабудовы, якія прасочваюцца і зараз, вельмі блізкія да праектнай творчасці Дэйбеля [3, с. 68]. Цікава, што ў сапежынскім зборы чарцяжоў разам з творчасцю Бэкера маецца праект палацу ў Ружанах з 1750 г., падпісаны Я. З. Дэйбелям – нямецкім архітэктарам у Варшаве, які ад 1731 г. і амаль да самай смерці ў 1752 г. шмат праектаваў для канцлера ВКЛ Яна Фрыдэрыка Сапегі (1680–1751), будаваў яго велічны палац у Варшаве, які пазней перайшоў Сапегам з Ружан. У 1752 г. І. З. Дэйбля не стала і архітэктарам Сапег становіцца яго вучань Я. С. Бэкер [3, с. 68; 9, с. 249].

Новы росквіт іх рэзідэнцыі ў Ружанах наступіў пры праўленні Аляксандра Сапегі, які быў не толькі буйным дзяржаўным дзеячам, але і цудоўным знаўцам мастацтва, музыкі, літаратуры. Таму ў Ружанах сфарміравалася спрыяльнае культурнае асяроддзе для творчай дзейнасці Я. С. Бэкера. Яго першымі працамі сталі праект ружанскай царквы базыліян (1762), каля якой, напэўна, у 1779 г. узведзены будынак кляштара (захаваўся да нашага часу) і праект Малога тэатра (1765), выкананы для Дзярэчына ці Зэльвы. З асаблівым размахам, сімвалізуючы славутасць і веліч рода, пачынае перабудоўвацца і пашырацца па праекту Бэкера Ружанская рэзідэнцыя ў пераходных формах ад позняга барока да класіцызму. У 1784 г. Сапегі ўжо прымалі ў палацы караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, ехаўшага на сойм у Гародню [9, с. 249].

Аналіз творчасці Я. С. Бэкера дазволіў В. Калніну ўстанавіць паслядоўнасць правядзення і датыроўку выкананых прац па перабудове рэзідэнцыі. Так, яе праектаванне выконвалася ў 1760–1770 гг., унутраныя працы ў палацы праводзіліся ў 1772–1775 гг., будаўніцтва палацавага корпуса, прызначанага для тэатра і манежа, а таксама паўцыкульных аркад адбылося ў 1776–1777 гг. У 1772–1777 гг. узводзілася праезжая брама з бакавымі карпусамі. У 1777 г. будаўнічыя працы ў асноўным былі прыпынены [3, с. 85]. У час іх правядзення ранейшы палац Сапегаў быў значна перабудаваны пад кіраўніцтвам Я. С. Бэкера: 2 вежы на галоўным фасадзе былі разабраны, а тарцавыя ўключаны ў аб'ём палаца, які стаў сіметрычным ў плане. Да цэнтральнай часткі галоўнага фасада прыбудаваны порцік з падвойнымі пілястрамі і калонамі кампазітнага ордэра, завершаны 3-вугольным франтонам са скульптурай. У дэкаратыўным аздабленні палаца сумяшчаліся рысы позняга барока і класіцызму. Адначасова створаны палацавы комплекс з некалькіх згрупаваных вакол параднага карпусоў, з паркам, садамі і аранжарэяй. Сіметрычныя бакавыя карпусы размешчаны перпендыкулярна палацу і злучаны з ім паўцыркульнымі ў плане аркадамі. Усходні корпус быў падзелены параднай лесвіцай на 2 роўныя часткі: тэатр і манеж. Тэатр меў глыбокую сцэну з 7 планамі куліс, што давала магчымасць тройчы мяняць афармленне ў час спектакля. Да сцэны прылягалі невялікія гардэробныя. Падковападобная ў плане зала была 2-ярусная – у 1-м ярусе было

14 ізаляваных лож, на 2-м – 15 з каралеўскай у цэнтры. Ложы ўпрыгожвалі ажурныя балюстрады, калоны карынфскага ордэра. У Заходнім корпусе, які не захаваўся, размяшчалася карцінная галерэя і бібліятэка. Да гэтых карпусоў былі прыбудаваны два флігелі, дзе размяшчаліся кухня і канюшня. Паралельна палацу па восі двара пабудавана ўязная брама з 2-павярховымі флігелямі па баках для варты і канцэлярыі. Брама вырашана накшталт 3-пралётнай трыумфальнай аркі, упрыгожана разнымі геральдычнымі картушамі з маронага дубу. Фасады будынкаў дэкарыраваны руставанымі пілястрамі, ляпнымі гірляндамі, скульптурай, разнастайнымі абрамленнямі акон. Усё гэта было аб'яднана паўкруглымі ў плане каланадамі і манументальнай агароджай [8, с. 368; 1, с. 25]. Як бачна, у палацавым ансамблі Бекер захаваў традыцыйную барочна-прасторавую кампазіцыйную планіроўку такіх комплексаў: з сіметрычна пастаўленымі карпусамі, флігелямі, напаўадкрытым дваром – курданёрам, аркай – брамай. Разам з тым у Ружанскім палацы знайшлі шырокае выкарыстанне формы і прыёмы, характэрныя для стылю класіцызму, – зварот да матываў портыка і франтона, пілястры і калоны кампазітнага ордэра [10, с. 25]. З 1795 г. у палацавым комплексе размяшчаліся суконныя і ткацкія фабрыкі. У 1914 г. – комплекс пашкоджаны. Часткова рэстаўрыраваны ў 1930 г., у 1944 г. у час Вялікай Айчыннай вайны разбураны. Захаваліся галоўныя і ўсходнія карпусы, аркады, уязная брама і флігелі, фрагменты аздобы інтэр'ераў і канструкцый перакрыццяў. Зараз праводзіцца рэканструкцыя помніка, якая была пачата ў 2008 г. На сённяшні дзень адноўлена ўязная брама з бакавымі да яе флігелямі [11].

Увагі заслугоўвае таксама праца Бэкера па стварэнні новага парку для Ружанскай рэзідэнцыі Сапегаў. Створаную ім планіровачную структуру перадае схема з подпісамі на французскай мове («План парку паблізу Ружан»). Ён размяшчаўся з паўночнага боку палацавага ансамбля, ад якога па схілу былі зроблены каскадныя лесвічныя спускі. Падобна, што парк быў накладзены на яго старую рэгулярную планіроўку пры палацы часоў Льва Сапегі. У аснову новай кампазіцыі парка Я. С. Бэкерам пакладзены прынцып радыяльна-праменевага размяшчэння алей, якое з'яўляецца характэрным матывам садова-паркавага мастацтва французскага архітэктара А. Ленотра, што ён ужыў у загараднай рэзідэнцыі Людовіка XIV у Версалі. Прынцып шматпраменевай кампазіцыі быў пакладзены Бэкерам таксама ў аснову звярынца, запланаванага сярод леса, які прымыкаў да парка. Да вялікага круга ці алтанкі ў цэнтры вялі восем алей – просек. Па перыметры круга паміж просекамі намаляваны паляўнічыя павільёны з ламанымі мансарднымі дахамі [9, с. 253]. У цэнтры быў запланаваны паляўнічы замак, які па архітэктуры нагадваў пабудовы італьянскага Адраджэння. Аднак няма ўпэўненасці, што праект парка і тым больш звярынца быў цалкам рэалізаваны.

Акрамя палаца у Ружанах па праекту і пад кіраўніцтвам Я. С. Бэкера была абноўлена забудова цэнтральнай плошчы мястэчка ў барочна-ракайльным стылі з элементамі класіцызма. У прыватнасці, у час гэтых прац

на сродкі Сапегаў была ўзведзена ўніяцкая з аднавежавым фасадам Петрапаўлаўская царква і кляштар пры ёй, быў створаны не рэалізаваны цалкам праект перабудовы прыхадскога касцёла, побач з ім была ўзведзена карчма з цэнтральнай двухпавярховай часткай і аднапавярховымі да яе прыбудовамі, што нагадваюць традыцыйныя пабудовы барока на тэрыторыі Беларусі [1, с. 27].

Адначасова з перабудовай палаца-паркавага ансамбля ў Ружанах Я. С. Бэкерам вялося ў двух кіламетрах ад яго ўзвядзенне ў пераходных формах ад барока да класіцызма загараднай рэзідэнцыі (не захавалася) Аляксадра Сапегі ў Крыстыянопалі [9, с. 254]. Пры гэтым будаўнічая дзейнасць Сапег выходзіла далёка за межы іх ружанскай рэзідэнцыі і ахоплівала іншыя ўладанні – Высокае, Дзярэчын, Друю і Зэльву. Там былі пастаўлены па праектах Бэкера разнастайныя па функцыянальнаму прызначэнню пабудовы. Найбольш значныя з іх – будынак ваеннай навучальнай установы («Акадэмія») у стылі класіцызму ў Дзярэчыне і шпіталя ў Высокім. У будынку акадэміі для надання яго вобліку раскошы выкарыстаны велічавы васьмікалонны порцік са здвоенымі калонамі накшталт порціка усходняга фасада Луўра. Фасады шпіталя таксама ўпрыгожвалі порцікі, але галоўны акцэнт быў зроблены на вялікі антычный порцік пасярэдзіне [1, с. 27; 12, с. 197].

Такім чынам, дзякуючы Яну Самуэлю Бэкеру ранейшы замак Сапегаў у Ружанах быў пераўтвораны ў вытанчаны барочна-класіцыстычны палацава-паркавы комплекс, а пабудовы архітэктара ў рэзідэнцыях гэтага роду далі значны імпульс пераходу ад позняга барока да ранняга класіцызму ў беларускім мастацтве.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Морозов, В. Ф.* История архитектуры Беларуси. Эпоха классицызма / В. Ф. Морозов. – Минск : БНТУ, 2006. – 152с.

2. *Грыцкевіч, А.* Сапегі / А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш]. – Мінск : БелЭн, 2006. – С. 545–550.

3. *Калнін, В. В.* Архітэктура Яна Самуэля Бэкера / В. В. Калнін // Спадчына. – 1998. – № 3–4. – С. 65–86.

4. *Aftanazy, R.* Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczyposlitej. Województwo brzesko-litewskie, nowogródzkie / R. Aftanazy. – Wroclaw, Warszawa, Kraków: Wyd. PAN, 1992. – T. 2. – 186 S.

5. *Kalnin, W.* Nurt barokowy w twórczści J.S. Beckera architekta domu Sapechów // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litęwskiego w epoce baroku. Warszawa: Wyd. PAN, 1995. – S. 213–228.

6. *Бэкер Ян Самуэль* // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед.; рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 576.

7. *Калнін, В.* Бэкер Ян Самуэль / В. Калнін // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш]. – Мінск : БелЭн, 2005. – С. 297.

8. *Габрусь, Т. В.* Ружаны: Дворцовый комплекс / Т. В. Габрусь // Свод памятников истории и культуры Белоруссии : Брестская область. – Минск: БелСЭ, 1990. – С. 367–368.
9. *Федорчук, А. Т.* Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорчук. – 2-е изд. – Минск : БелЭн, 2006. – 576 с.
10. *Лазука, Б. А.* Гісторыя беларускага мастацтва: у 2 т. Т. 2: XVIII – пачатак XXI стагоддзя / Б. А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2007. – 351 с.
11. Ружанскі палац [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: www. belarus.by / ru / travel / belarus – life / ruzhany – palace. – Дата доступу : 20.04.2017.
12. *Кулагін, А. М.* Дзярэчанскі палац / А. М. Кулагін // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед.; рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 197.

**М. В. Стрелец**

## ФУНДАМЕНТАЛЬНОЕ ИССЛЕДОВАНИЕ БЕЛОРУССКОГО УЧЕНОГО-ГЕРМАНИСТА

Доцент кафедры историко-культурного наследия Беларуси государственного учреждения образования «Республиканский институт высшей школы» Дмитрий Адамович Мигун имеет в своем активе труд, выход которого стал важной вехой в исследовании белорусско-германских связей. Речь идет о его монографии «Беларусь в германо-советских отношениях (ноябрь 1918 – июнь 1941 гг.)». Комплексный анализ данной монографии является целью настоящего доклада. Вниманию участников конференции предлагается исчерпывающий разбор всех структурных компонентов монографии. Она состоит из введения, трех глав, заключения, библиографического списка.

Во введении раскрыта актуальность избранной темы, показан теоретико-методологический инструментарий исследовательского процесса, очерчены предмет и объект исследования, проанализировано современное состояние базы источников, подведены итоги изысканий коллег автора на предмет исследования; выявлены те неосвоенные исследовательские поля, на которых решил сосредоточиться доцент кафедры историко-культурного наследия Беларуси государственного учреждения образования «Республиканский институт высшей школы».

Первая глава называется так: «Беларусь в системе политического, экономического и культурного германо-советского взаимодействия (ноябрь 1918–1933 г.)». Исходя из названия главы, включены три параграфа: «Политические связи», «Экономическое сотрудничество», «Культурное взаимодействие».

Первый параграф первой главы включает следующие сюжетные линии: 1) влияние Брестского мирного договора на судьбу белорусского народа;